

Залеская талака

Інфармацыйны бюлетэнь Залескага сацыяльна-дзелавога цэнтра ГА "Сяльчанка" Смаргонскога р-на / №4 (22)/красавік 2013

Общественная активность — полюс конкурентоспособности. Формирование агротуристического кластера в Сморгонском районе

«Партнерство — фактор конкурентоспособности местных сообществ» — так называлась Общественная экспедиция по формированию и развитию агротуристического кластера в Сморгонском районе, состоявшаяся 23 апреля 2013 года. Ее продолжением на следующий день (24 апреля 2013 года в г. Сморгони) стало мероприятие – «Деловое кафе «Внедрение принципов кластерной экономики в сфере агротуризма. Деловое и межсекторное партнерство».

Оба мероприятия были организованы в тесном сотрудничестве Общественной организации «Сельчанка» Сморгонского района, туристско-информационного центра Сморгонского райисполкома, местного благотворительного фонда «Северные Афины» и учреждения «Экономический полюс» (г. Минск).

Общественная экспедиция носила информационно — исследовательский характер. Она проходила по территории Залесского и Кревского сельских советов и была направлена на оценку потенциала возможного туристического маршрута; знакомство с активными и творческими людьми, сельскими агроусадьбами, изучение уровня готовности потенциальных субъектов агротуризма к участию в туристическом кластере. В ходе экспедиции состоялись встречи с местными жителями по изучению их интереса к партнерству и сотрудничеству.



Деловое кафе проходило за чашкой чая с презентациями экспертов и неформальной дискуссией участников. На мероприятии состоялось общественное обсуждение перспектив создания и развития агротуристического кластера в Сморгонском районе, представление и обсуждение с представителями местных органов власти, общественности, бизнеса и экспертами принципов кластерной экономики в сфере агротуризма, результатов общественной экспедиции и местных приоритетов в интересах устойчивого развития территории, вопросы формирования агротуристического кластера в Сморгонском районе и вовлечение бизнеса в его развитие. Участники высказали Сморгонскому Общественному совету по развитию агротуризма пожелание организовать более системную работу с хозяевами агроусадеб в районе. Было отмечено значение реализации «Стратегии устойчивого развития МП 21 д. Залесье» в активизации общественности в решении вопросов устойчивого развития на селе и развитии туристического направления в регионе.



В мероприятиях принимали участие хозяева агроусадеб, представители администрации Сморгонского РИК, Залесского и Кревского сельских советов, НКО, эксперты, члены инициативной группы по МП21 д. Залесье, деятели культуры и образования, представители частного бизнеса, представители региональных и республиканских СМИ. Объединяющим моментом обеих мероприятий стало реальное партнерство всех заинтересованных сторон в поиске эффективных подходов к внедрению идей устойчивого развития на селе и желание совместными усилиями разработать стратегию развития агротуризма в Сморгонском районе, которая будет подготовлена в 2013 году.


Мероприятия были включены в программу Недели устойчивого развития (НУР), которая проходила в этом году под девизом «Партнерство в действии». Организаторы НУР — Минский образовательный центр им. Й.Рау и Программа поддержки Беларуси Федерального правительства Германии www.fpb-belarus.org . Мероприятие Общественная экспедиция «Партнерство как фактор конкурентоспособности местных сообществ» было проведено в Сморгонском районе при поддержке организаторов Недели устойчивого развития в Беларуси.

Галина Матюшенко,
специалист по работе с сообществами,
Учреждение «Экономический полюс», г. Минск



Зарабляць грошы вучыць… школа

Ці з'явіцца ў нашым Залессі школьная бізнэс-кампанія? На гэта пытанне адказала завуч Залескай сярэдняй школы-сада Валянціна Шыпілава. Па словах Валянціны Уладзіміраўны, ідэя стварэння такой кампаніі ўжо ёсць, але для яе ажыццяўлення яшчэ трэба добра папрацаваць. Ёсць таксама пару задумак і наладжваюцца сувязі з адной са школ Мінскага раёна, дзе ёсць патрэбны досвед. Плануецца, што займацца школьнай бізнэс-кампаніяй у Залескай школе будзе настаўніца матэматыкі Наталля Гарбачова разам з вучнямі 8, 9 і 10 класаў. Сярод магчымых накірункаў працы - правядзенне школьнікамі экскурсій па маёнтку Міхала Агінскага, выраб сувеніраў, вырошчванне расады… Спіс можна дадумаць і працягнуць. Застаецца пажадаць поспехаў і ўдачы нашай школе!


Адукацыйны трэнінг па тэме "Эканамічныя аспекты прадпрымальніцкай дзейнасці/снежань 2012 Залеская школа-сад

У Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці налічваецца ўжо 18 школьных бізнэс-кампаній. Дванаццаць з іх атрымалі падтрымку на ўзроўні раёна, пра што і распавядае цікавы матэрыял газеты «Звязда».

Дзень, калі падлетак зарабіў першы ў сваім жыцці «рубель», запамінаецца назаўсёды. Аднак кудысьці ўладкавацца 14-гадоваму школьніку даволі складана. Працаваць ён павінен не больш за чатыры з паловай гадзіны, а аплата павінна налічвацца яму ў поўным аб'ёме. Ды нават калі работа і знойдзецца, дзе ж знайсці час на выкананне хатніх заданняў? На Міншчыне вырашылі пайсці іншым шляхам: у звычайных сярэдніх школах пачалі ствараць бізнэс-кампаніі. Старшакласнікі вырабляюць прадукцыю, прадаюць яе і атрымліваюць за гэта грошы — зусім як у дарослым жыцці. Журналіст «Чырвонкі» зазірнуў у бізнэс-кампанію «Крыніца», якая працуе ў сярэдняй школе № 4 горада Дзяржынска.

— Зараз на Дзяржыншчыне працуюць 18 школьных бізнэс-кампаній, дванаццаць з іх атрымалі падтрымку на ўзроўні раёна. Амаль усім у такіх арганізацыях распараджаюцца падлеткі. Дарослыя ж толькі назіраюць за працэсам і ўмешваюцца ў яго выключна тады, калі ў гэтым узнікае патрэба. У нейкай ступені работу бізнэс-кампаніі можна лічыць сучаснай эканамічнай гульнёй, у якой ёсць і бонусы для яе ўдзельнікаў, — мяркуе начальнік аддзела адукацыі Дзяржынскага райвыканкама Вацлаў Матусевіч. — Яны не толькі атрымліваюць грошы за прададзеныя вырабы, але і набываюць першы досвед работы ў сучасных эканамічных умовах.

Праца бізнэс-кампаніі прыносіць плён не толькі дзецям, але і самой навучальнай установе: школа ці гімназія атрымлівае грошы ад пазабюджэтнай дзейнасці.

Гэтай думкі прытрымліваецца і дырэктар сярэдняй школы № 4 Дзяржынска Зінаіда Федаровіч:

— Ідэя стварыць бізнэс-кампанію ў школе з'явілася яшчэ пазалетась. Але перш чым заняцца новай справай, мы вывучалі вопыт школ-першапраходцаў. Пасля трэба было знайсці настаўніка-энтузіяста, які б пагадзіўся кіраваць арганізацыяй. Ім стала выкладчыца матэматыкі Наталля Прыкота.

Ніякія глабальныя мэты перад сабой «Крыніца» не ставіць. Перш за ўсё трэба навучыць школьнікаў асновам эканомікі. Трэба, каб юнак або дзяўчына непасрэдна ўбачылі на практыцы, што і як працуе.

Структура бізнэс-кампаніі — простая. На яе чале стаіць штаб з трох адзінаццацікласнікаў, якія займаецца перш за ўсё арганізацыйнымі пытаннямі.

Пасля мы набралі 9 швей з ліку школьніц і заключылі з імі працоўныя дагаворы. Пры гэтым выконваліся тры ўмовы — узрост не менш за 14 гадоў (згодна з Працоўным кодэксам), пісьмовая згода бацькоў і жаданне дзяўчыны працаваць. Знаходзяцца ў майстэрні яны пераважна па суботах, не больш за чатыры гадзіны.

Па выніках працы складаецца адпаведны акт, і ўжо школьная бухгалтэрыя налічвае маладым работнікам грошы. Форма аплаты — здзельная. Зразумела, што аб мільённых сумах гаворка не ідзе. Але на кішэнныя выдаткі зарабіць можна з ліхвой. Спецыялізацыя кампаніі вызначалася, зыходзячы з таго, што ў школе ёсць добрая швачная майстэрня. Вядома, яна патрабуе мадэрнізацыі, на што і будзе выдаткавана частка прыбытку.

— Трэба было вывучаць амаль усё з нуля, ісці метадам спроб і памылак, — прыгадвае Наталля Прыкота. — Нават калі распрацоўвалі бізнэс-план, змарнавалі шмат сіл і часу. Спачатку настаўніку давялося вывучаць усю патрэбную інфармацыю, а пасля тлумачыць яе дзецям.

Спецыфіка «Крыніцы» ў тым, што яна працуе толькі па папярэдніх заказах. І першым сур'ёзным выпрабаваннем стаў заказ ад мясцовага Цэнтра развіцця дзіцяці на пашыў пасцельнай бялізны. Са школьнай майстэрні выйшлі 498 камплектаў — падкоўдранікі, прасціны, навалачкі… І ніводны не быў забракаваны. Зараз жа неабходна абнавіць бялізну ў групах падоўжанага дня ў самой школе, чым і зоймуцца работнікі «Крыніцы». Але працу тармозіць тое, што пакуль не да канца адпрацавана нарматыўная база, якая датычыцца менавіта школьных бізнэс-кампаній.

Пасцельную бялізну больш не шые ніводная школьная бізнэс-кампанія ў раёне. Канкурэнты для «Крыніцы» — Дзяржынская швачная фабрыка і Камбінат надомнай працы… Але ж гэта і зусім іншы ўзровень!

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Мінск — Дзяржынск.

Залессе ў інтэрнэце – www.zalesse.by!





«,,,28 красавіка 1802 года я з'ехаў з Пецярбургу з намерам назаўсёды пасяліцца ў вёсцы, недалёка ад Вільні,,,»

Так пісаў у сваіх мемуарах князь Міхал Клеафас Агінскі - дзяржаўны дзеяч, былы паўстанец, кампазітар-аматар, пра той час, калі ён прыехаў у Залессе.

Заснавальнік ГА "Сяльчанка" Смаргонскога р-на / адрас:в.Залессе, вул. Чыгуначная. Гал. рэдактар Дар'я Ліс, тэл. для сувязі +375296553013 www.zalesse.by
250 асобнікаў, распаўсюджваецца бясплатна.